**Хацкевіч Аксана**

## Балада пра бярозу

Лагоднае неба, пяшчотнае неба,
На полі рыхтуецца глеба для хлеба.
І трактар малюе там стужкі-разоры,
Іх мірна вітаюць блакітныя зоры.
Ды вось незадача: бярозка-сястрыца,
І трэба ж было тут, на полі, з'явіцца!
Стаіць пасярэдзіне так нерухома,
Як быццам палеткаў тутэйшых ахова.
Шуміць веснавое ў бярозкі ўбранне,
Вось гэта праблема! Вось гэта спатканне!
А ствол перарэзаны рэшткай гарматы.
"Дык гэта пасланне",- прамовіў араты,
Успомніў ён дзеда вяртанне дадому,
Як вёў франтавую сваю перамову,
Як бабка чакала, як плакалі дзеці:
"Калі ж гэта татка дадому прыедзе?"
І татка вярнуўся, уцалелы і важны,
Як волат, асілак, магутны, адважны.
Уся гімнасцёрка на дзірачках у дзеда…
"Вось гэтак давалася, унучак, пабеда".
Куфэрак каштоўны прывёз ён з сабою,
Вялікай аплочаны быў ён цаною.
А рэчаў у куфэрачку тым небагата,
Але ж напамін пра былога салдата.
Там пяць медалёў акурат як ляжалі,
І дзеці зайздросна на іх пазіралі:
Медаль за адвагу, за мужнасць і славу,
А зверху, як зорка, маленечкі самы.
І зорачку дзед да грудзей прыціскае,
І моцнай далонню слязу выцірае.
Разумны ўнук не пытае пра слёзы…
Прысеў наш араты ля старай бярозы.
Успаміны пранесліся, быццам імгненне,
Ізноў – рэчаіснасць, ізноў – ажыўленне.
На трактар араты бадзёра ўскочыў,
Ля ціхай бярозкі раллю сваю збочыў.
Араты не першы сустрэўся з бярозай –
Тут многія лілі гарачыя слёзы.
Не можа падняцца рука недаверу,
Каб вечную памяць пусціць пад сякеру.